*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**16** ЛІСТАПАДА 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 218 (26083)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «прамыя лініі»!

## ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, а таксама некаторых аспектаў народнай медыцыны, адкажуць падчас «Прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

Вы зможаце атрымаць адказы, калі патэлефануеце на нашу «Прамую лінію» **21 лістапада з 12.00 да 14.00 па нумарах: 292 38 92, 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03.)**

## ЗДАРОЎЕ ЖАНЧЫНЫ — ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ

На любыя вашы пытанні, паважаныя жанчыны, адкажуць унікальныя мужчыны, аўтары ўсіх сучасных падручнікаў па акушэрству і гінекалогіі для будучых беларускіх спецыялістаў (студэнтаў і навучэнцаў) у агучанай галіне прафесар кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук **Іван Уладзіміравіч ДУДА**, дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук **Віталь Іванавіч ДУДА**, дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук **Уладзімір Іванавіч ДУДА**.

«Прамая лінія» адбудзецца **23 лістапада, у пятніцу, з 15.00 да 17.00** па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

Падпіска-2008

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

**ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8800 | 26400 | 52800 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8300 | 24900 | 49800 |
| 63858 (ведамасны) | 14000 | 42000 | 84000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 12800 | 38400 | 76800 |
| **ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» «Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)** | | | |
| 63850 (індывідуальны) | 7460 | 22380 | 44760 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 6990 | 20970 | 41940 |
| 63858 (ведамасны) | 9938 | 29814 | 59628 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 9431 | 28293 | 56586 |

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «БЕЛАРУСЬ НЕ БУДЗЕ МЯНЯЦЬ ВЫБРАНЫ КУРС РАЗВІЦЦЯ»

***Прэзідэнт Беларусі 15 лістапада разгледзеў кадравыя пытанні. Кіраўнік дзяржавы назначыў:***

**МАРАЗЕВІЧА Анатоля Мікалаевіча** — рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

***Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:***

**КУРАША Віктара Іосіфавіча** — намеснікам міністра культуры;

**НІКАЛАЙКІНА Віктара Паўлавіча** — намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама;

**ГІШКЕЛЮКА Пятра Аляксандравіча** — старшынёй Браслаўскага райвыканкама;

**ШАЎЧУКА Мікалая Мікалаевіча** — старшынёй Полацкага райвыканкама;

**КАЧАНАВАЙ Наталлі Іванаўны** — старшынёй Навапалацкага гарвыканакама;

**БУДКЕВІЧА Васіля Антонавіча** — кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Віцебска;

**БАРЫСЕНКІ Валянціна Васільевіча** — намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

**ЯРМАША Пятра Арсеньевіча** — старшынёй Мінскага райвыканкама;

**ТАБАНЮХАВА Алега Міхайлавіча** — намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама;

**ВАСІЛЬЕВА Барыса Анатольевіча** — кіраўніком адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска;

**ФАМІНА Ігара Аляксеевіча** — дырэктарам Дэпартамента цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі;

**ЯКУБОВІЧА Паўла Вацлававіча** — генеральным дырэктарам дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга»;

**ШЛЫКАВА Уладзіміра Віктаравіча** — генеральным дырэктарам вытворча-гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белмедтэхніка»;

**ЦЮЦЮНОВА Анатоля Дзмітрыевіча** — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Керамін»;

**ДУДКІНА Анатоля Канстанцінавіча** — Беларускім транспартным пракурорам;

**РАКЕВІЧА Аляксандра Іванавіча** — начальнікам упраўлення Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Генадзь Нявыглас падкрэсліў, што ўсе кандыдаты адбіраліся на конкурснай аснове ў адпаведнасці з прынцыпамі кадравай работы, якая праводзіцца ў нашай краіне.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць павышэння аўтарытэту Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. «Акадэмія кіравання павінна быць лепшай навучальнай установай краіны. Мы рыхтуем тут кіраўніцкую эліту», — падкрэсліў ён. Беларускі лідар дадаў, што мае намер часцей сустракацца з калектывам ВНУ і студэнтамі.

Гэта вырашэнне кадравых пытанняў было звычайным, планавым мерапрыемствам. Разам з тым кіраўнік дзяржавы зрабіў некалькі важных стратэгічных заяў на доўгатэрміновую перспектыву, якія адносяцца да дзейнасці кіраўнікоў усіх узроўняў улады ў краіне.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

Падрабязнасці

# ЮБІЛЕЙНАЕ МАГІЛЁЎСКАЕ ДЗІЦЯТКА



Фота БЕЛТА.

**6 лістапада ў Магілёве нарадзілася Вераніка Гаўрылава — 370-тысячная жыхарка абласнога цэнтра. Пра гэта «Звязда» паведаміла ў мінулым выпуску «Краіны здароўя.**

Новая магілёўская славутасць важыць амаль 4 кілаграмы, мае рост 53 сантыметры і цяпер пераважна есць і спіць. «Сярэднестатыстычнае немаўля!» — ласкава ўсміхаецца яе маці Наталля. «Прыгажуня!» — упэўнены замілаваныя магілёўцы.

Бацькі Веранікі цярпліва адказваюць на шматлікія пытанні журналістаў, але прызнаюцца, што не прывыклі да такой увагі. Гаўрылавы — звычайная магілёўская сям'я. 33-гадовая Наталля працуе настаўніцай малодшых класаў у сярэдняй школе № 22, 35-гадовы Уладзімір — майстрам на прадпрыемстве «Магілёўхімвалакно». Іх старэйшаму сыну Ігару 12 гадоў.

Магілёўцы Наталля і Уладзімір сустрэліся на навагодняй вечарыне і разам сустрэлі 1994 год. Больш маладыя людзі не развітваліся. Закаханыя хутка зразумелі, што ім добра разам. Наступны Новы год Наталля і Уладзімір сустрэлі ўжо мужам і жонкай. Гаўрылавы жывуць у міры і згодзе ўжо 13 гадоў.

— Мы вельмі хацелі дачку, і моцна спадзяваліся на нараджэнне дзяўчынкі, — расказвае Наталля. — І вельмі ўзрадаваліся навіне, што Вераніка стала 370-тысячнай жыхаркай нашага горада. Нас столькі людзей за гэтыя дні павіншавалі! Усе рады за нас! Дзякуй!

Малая выпісана разам з маці з радзільнага аддзялення Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай дапамогі і цяпер гадуецца дома, пад апекай сваякоў выязджае на нядоўгія прагулкі і праходзіць агляды ўчастковых педыятра і медсястры.

Вераніка набірае вагу і сілы, каб браць удзел ва ўрачыстай цырымоніі рэгістрацыі нараджэння, якая адбудзецца на наступным тыдні ў Палацы грамадзянскіх абрадаў. У ёй возьмуць удзел кіраўніцтва горада, сябры і калегі Гаўрылавых, магілёўскія артысты.

Усе рыхтуюць для Веранікі падарункі. Напрыклад, арганізатары Міжнароднага фестывалю «Свет мёду і здароўя», які цяпер гасцюе ў Магілёве, вырашылі ўручыць 100-кілаграмовую бочку мёду — каб была здаровай і радавала магілёўцаў сваёй усмешкай.

Ад Магілёўскага гарвыканкама Гаўрылавы атрымаюць галоўны прыз: грашовую прэмію ў 1000 базавых велічынь — больш за 30 млн рублёў. Гэтыя грошы будуць вельмі дарэчы: нядаўна маладая сям'я пабудавала 3-пакаёвую кватэру за крэдытныя сродкі. Аддаваць іх трэба было б аж 40 гадоў, а цяпер ёсць магчымасць часткова разлічыцца з доўгам.

Бацькі, безумоўна, рады грашоваму падарунку, але гавораць, што для іх самае галоўнае, каб дзяўчынка расла здаровай і была шчаслівай. А будучае ўсё пакажа.

Дарэчы, магілёўскія ўлады абяцаюць такім жа чынам ушаноўваць і кожнага наступнага 10-тысячнага жыхара абласнога цэнтра. Так што сем'і, дзе нарадзяцца новыя, так бы мовіць, юбілейныя дзеці, таксама атрымаюць прэміі. Верагодна, што гэта адбудзецца не ў такім ужо далёкім будучым: нараджальнасць у Магілёве павялічваецца.

**Ілона ІВАНОВА.**

Грошы

# БЕЛАРУСЫ НАБЫЛІ АМАЛЬ $3 МІЛЬЯРДЫ 790 МІЛЬЁНАЎ

**Сёлета беларусы абмянялі ў банках краіны значна больш замежнай валюты на рублі, чым летась, пра што сведчаць даныя, якія карэспандэнту нашай газеты прадаставілі ў Нацыянальным банку Беларусі.**

Так, паводле інфармацыі прэс-сакратара галоўнага банка краіны Міхаіла Журавовіча, аб'ём прапанаванай насельніцтвам на ўнутраным валютным рынку ў студзені—верасні гэтага года СКВ склаў каля 3 млрд 463 млн долараў ЗША, што больш у параўнанні з адпаведным мінулагоднім перыядам на 40 працэнтаў. А вось попыт з боку людзей на замежную валюту вырас усяго на 28,6 працэнта: беларусамі за 9 месяцаў куплена каля 3 млрд 789 млн долараў. У цэлым з пачатку года чыстая купля насельніцтвам валюты за кошт наяўных сродкаў і безнаяўных пералічэнняў склала каля 333 млн долараў, што на 148,5 млн долараў, або на 30,8 працэнта, менш, чым за такі ж леташні перыяд.

Як вынікае з апошніх даных галоўнага банка па дэпазітах насельніцтва, яны за 10 месяцаў істотна папоўніліся — у пераразліку на нацыянальную валюту рублёвыя і інвалютныя дэпазіты павялічыліся амаль на 2 трлн рублёў, або на 25,1 працэнта. Гэта пры тым, што згодна з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2007 год, прадугледжваўся прырост дэпазітаў беларусаў за ўвесь год максімум на 2 трлн рублёў. За студзень—кастрычнік рублёвыя ўклады ўзраслі амаль на 1 трлн рублёў (на 17,9 працэнта), а ў замежнай валюце — больш як на 463 млн долараў ЗША (на 39,9 працэнта).

Такім чынам, на пачатак гэтага месяца агульная сума дэпазітаў грамадзян дасягнула амаль 9,8 трлн рублёў: у нацыянальнай валюце яны склалі каля 6,3 трлн рублёў, а ў замежнай — у эквіваленце больш за 1,6 млрд долараў.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**


**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства объекта незавершенного строительства (без консервации) в составе: административное здание, производственный корпус молочного завода, расположенного по адресу: г. Смолевичи, ул. Социалистическая, 54. Начальная цена —1345016 460 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.08.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 04.12.2007г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 03.12.2007г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к.326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.**

**БЕЛИНВЕСТБАНК**

***сообщает, что 6 декабря 2007 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29 в 11.00 проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме.***

**Повестка дня собрания:**

1. О процедурных вопросах.
2. О внесении изменений в Устав ОАО «Белинвестбанк».
3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Лица, имеющие право на участие в собрании и желающие принять в нем участие, могут обратиться за получением бюллетеней для голосования и иной информации в банк или его филиалы до 3 декабря 2007 года.

**Адреса филиалов банка и телефоны для справок:**

224030, г. Брест, ул. Советская, 50, тел./факс (8-0162) 23-08-36
210015, г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел./факс (8-0212) 29-75-46
246050, г. Гомель, ул. Советская, 7, тел./факс (8-0232) 74-11-45
230023, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел./факс (8-0152) 72-02-13
220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (8-017) 289-28-26, 334-45-98
220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел./факс (8-017) 217-30-66
220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел./факс (8-017) 203-93-96
212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел./факс (8-0222) 22-03-35

Заполненные бюллетени для голосования следует направлять в Центральный банк по адресу 220004, г. Минск, пр-т Машерова, 29 либо в региональные филиалы по вышеуказанным адресам.

**Правление ОАО «Белинвестбанк».**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 3 от 27.10.2006*

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ КОМИССИИ ПО РАБОТЕ С ИМУЩЕСТВОМ, ОБРАЩЕННЫМ В ДОХОД ГОСУДАРСТВА, ПРИ БОРИСОВСКОМ РАЙИСПОЛКОМЕ**

проводят открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства гаража № 153 общ. пл. 52,4 кв.м, расположенного: г. Борисов, ул. 50 лет БССР. Начальная цена 9687900 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с №3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 18.12.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8 017) 224 61 34, (8 0177) 73 93 27.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**


По чутках і аўтарытэтна

# Увесці абавязковае дэкларыванне даходаў, якія накіроўваюцца на будаўніцтва жылля, пакуль не плануецца

**Днямі ў пэўных выданнях прайшла пагалоска аб тым, што нібыта рыхтуецца нейкі дакумент аб магчымым абавязковым дэклараванні асабістых даходаў, якія накіроўваюцца на будаўніцтва і набыццё жылля.**

**Пракаментаваць гэту інфармацыю згадзіліся пастаянныя эксперты «Звязды» старшыня Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ і начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Галіна РАДЗЮКЕВІЧ.**

— Заклікі з падобнай ініцыятывай сапраўды існуюць з боку сталічных функцыянераў, якія разлічваюць такім чынам паскорыць адкат цэнаў на другасную нерухомасць Мінска, — патлумачыў навіну Мікалай Прасталупаў. — З другога боку, уявіце, хто будзе дэклараваць, што ў яго ёсць 100 тысяч долараў для набыцця двухпакаёвай кватэры? Калі гэта адбудзецца, то ў дакументах пры ажыццяўленні здзелак будзе адна сума, а непасрэдна прадаўцу будзе выплачвацца ўжо зусім іншая. Такімі адміністрацыйнымі метадамі магчыма толькі часова «замарозіць» высокія цэны на жыллёвую нерухомасць, а кардынальна вырашаць праблему трэба іншымі эканамічнымі шляхамі. Падобныя абмежавальныя схемы ўжо існавалі раней, аднак пакупнікі і прадаўцы ўсё роўна адшуквалі шляхі ўзаемаразлікаў з захаваннем сваіх інтарэсаў. Спадзяюся, што дзяржава не пойдзе на такі эксперымент, каб зноў заганяць людзей у «шэрыя» схемы.

— Магчыма, падобнае новаўвядзенне было б мэтазгодна зрабіць, бо сапраўды ў сферы будаўніцтва жылля цяпер абарочваюцца даволі аб'ёмныя фінансавыя сродкі, крыніцы якіх не заўсёды цалкам празрыстыя. У нас і сёння існуе механізм адраснага кантролю, калі ў грамадзян могуць запатрабаваць маёмасную дэкларацыю, каб высветліць адпаведнасць расходаў з рэальнымі даходамі, — паведаміла рэдакцыі Галіна Радзюкевіч. — Разам з тым зазначу, што пакуль у гэтым накірунку намі нічога новага не распрацоўваецца. Больш таго, нават у планах на змяненне падатковага заканадаўства на наступны год абавязковае дэклараванне даходаў, якія накіроўваюцца ў сферу будаўніцтва жылля, не прадугледжана.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПАМЯТНЫХ МАНЕТ СТАНЕ БОЛЬШ

**Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч, да канца гэтага года галоўны банк краіны плануе выпусціць у абарачэнне дадаткова шэраг памятных манет.**

Яшчэ да новага года пабачаць свет дзве манеты з серыі «Казкі народаў свету» — «Алісіны прыгоды ў дзівоснай краіне» і «Аліса ў залюстроўі». У рамках гэтай серыі ўжо выпушчана шэсць найменняў памятных манет. Выпуск залатых манет з устаўкамі з брыльянтаў (Ліса, Сокал-падарожнік) працягне манета «Воўк». Улічваючы наяўнасць попыту на еўрапейскім рынку на сярэбраныя памятныя манеты з устаўкамі камянёў «Сваро́ўскі», будуць адчаканены 2 сярэбраныя манеты з гэтымі камянямі — «Воўк» (з эскізам, ідэнтычным залатой памятнай манеце «Воўк»), а таксама — «Ваўкі».

У рамках шырокамаштабнай навуковай праграмы, якая праводзіцца па даследаванні Арктыкі і Антарктыкі, намечаны выпуск сярэбранай памятнай манеты «Міжнародны палярны год». А працягваючы выпуск памятных манет у рамках тэматыкі «Беларускі балет», Нацыянальны банк мяркуе выпусціць сёлета манеты «Беларускі балет. 2007». Як адзначаюць у галоўным банку, гэтая тэматыка памятных манет вельмі папулярная як на сусветным рынку, дзе прададзена больш за 12 000 манет, так і на рынку рэспублікі, на якім куплена каля 6000 памятных манет.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ISSN 1990 - 763X

07218>

9 771990 763008

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.11.2007 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 152,00 |
| 1 еўра | 3 153,22 |
| 1 латвійскі лат | 4 496,92 |
| 1 літоўскі літ | 913,24 |
| 1 чэшская крона | 118,60 |
| 1 польскі злоты | 863,17 |
| 1 расійскі рубель | 87,97 |
| 1 украінская грыўня | 428,69 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,4620 |
| 10 UAH | 48,2599 |
| 1000 BYR | 11,3460 |
| EUR | 35,9053 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 15.11.2007 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Галоўны Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## НЕ ПРАПУСЦІЎ ПЕШАХОДА — РАЗВІТАЙСЯ З ПРАВАМІ

**Усяго за паўгадзіны намеснік начальніка сталічнай ДАІ падпалкоўнік Піульскі пазбавіў вадзіцельскага пасведчання дваіх кіроўцаў, якія не прапусцілі пешаходаў.**

Апроч таго, як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама, яшчэ 8 такіх парушальнікаў былі аштрафаваныя. Такі несуцяшальны для «хамаватых» вадзіцеляў вынік мела прафілактычная акцыя «Не прапусціў пешахода — развітайся з правамі», якую правяла днямі сталічная Дзяржаўтаінспекцыя.

Дарэчы, ва ўпраўленні ДАІ Мінска паведамілі, што неўзабаве падобныя акцыі плануецца праводзіць штодзённа.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## ФАЛЬШЫВАМАНЕТЧЫКІ ЕЎРА «АБЫХОДЗЯЦЬ» БОКАМ?..

**За тры кварталы гэтага года па банкаўскай сістэме выяўлена 871 падробленая банкнота, што на 151 купюру менш у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Нацыянальным банку Беларусі.**

Як адзначаецца ў спецыяльна падрыхтаваным пісьме галоўнага банка, у прыватнасці, зменшылася колькасць фальшывых купюр долараў ЗША, у тым ліку і класа «супер», якія выяўляюцца найбольш цяжка. У той жа час узрасла колькасць выпадкаў вырабу і збыту банкнотаў, якія «надрукаваны» спосабам частковай падробкі, якіх аказалася 39 штук. Менш сталі падрабляць і еўра, якіх выяўлена 37 банкнотаў. Разам з тым, падкрэсліваюць у Нацбанку, па-ранейшаму працягваецца рост колькасці выяўленых падробленых банкнотаў Банка Расіі. Такіх знойдзена 120 штук, у той час як за аналагічны леташні перыяд іх было 76. Пры гэтым асноўную масу падробак (111 штук) склалі банкноты вартасцю 1000 рублёў. Некалькі павялічылася і колькасць выпадкаў вырабу і збыту падробак банкнотаў Нацбанка, большая частка якіх была прынята касірамі прадпрыемстваў гандлю, акцыянерных таварыстваў і іншых формаў уласнасці, што ажыццяўляюць рэалізацыю тавараў і паслуг за наяўны разлік. Выяўлены ж былі гэтыя фальшыўкі толькі пры пераразліку інкасаванай выручкі ў структурных падраздзяленнях Нацбанка і беларускіх банкаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## МАРШРУТЫ ЦЯГНІКОЎ БУДУЦЬ ЗМЕНЕНЫ

**У сувязі з рамонтам жалезабетоннага моста праз раку Днепр у Магілёўскай вобласці маршруты і графік цягнікоў 19—21 лістапада будуць зменены, паведамілі ў пасажырскай службе Беларускай чыгункі.**

Цягнікі будуць хадзіць па абходным маршруце праз Калінкавічы, а не праз Магілёў. Пры гэтым час іх праходжання павялічыцца на дзве і больш гадзіны. Некаторыя цягнікі будуць адменены. У іх ліку Гомель—Мінск, Гомель—Магілёў, Гомель—Калінкавічы, Гомель—Санкт-Пецярбург. Цягнікі будуць адпраўляцца раней за ўстаноўлены час. Супрацоўнікі Беларускай чыгункі загадзя папярэджваюць усіх пасажыраў аб змяненнях графіка і маршрутах праходжання пасажырскіх саставаў. Рамонт жалезабетоннага моста праз Днепр прадоўжыцца 27—29 лістапада. У гэтыя дні графік руху цягнікоў будзе таксама зменены.

**Вольга БЯЛЯЎСКАЯ, БЕЛТА.**

## УКРАЛІ... БІЯТУАЛЕТ

**Кінагрупа, якая здымае фільм непадалёк ад пасёлка Сапоцкін, арандавала ў адной гродзенскай фірмы біятуалет. Але аднойчы раніцай яго на сваім месцы не ўбачылі.**

Аказалася, што вока на яго паклаў 27-гадовы мясцовы жыхар. Моцна выпіўшы, малады чалавек позна ўначы перавёз прыбіральню на бартавым «УАЗе» з неахоўваемай здымачнай пляцоўкі ў свой хлеў. Аператыўнікі па слядах ад колаў выйшлі на злодзея, але ён так і не здолеў патлумачыць, на што разлічваў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


Минский городской центр недвижимости

**ОАО «ПАРИТЕТБАНК» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**

***проводят открытый аукцион***

*по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.*

| Номер лота | Номер машиноместа | Общая площадь, кв. м | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 | 12,8 | 15 238 080 | 1 523 808 |
| 2 | 2 | 11,9 | 14 166 653 | 1 416 665 |
| 3 | 3 | 11,9 | 14 166 653 | 1 416 665 |
| 4 | 4 | 11,9 | 14 166 653 | 1 416 665 |
| 5 | 5 | 11,9 | 14 166 653 | 1 416 665 |
| 6 | 6 | 12,0 | 14 285 700 | 1 428 570 |
| 7 | 7 | 12,0 | 14 285 700 | 1 428 570 |
| 8 | 9 | 12,2 | 14 523 795 | 1 452 380 |
| 9 | 13 | 12,2 | 14 523 795 | 1 452 380 |
| 10 | 16 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 11 | 17 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 12 | 20 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 13 | 21 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 14 | 22 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 15 | 27 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 16 | 28 | 12,5 | 14 880 938 | 1 488 094 |
| 17 | 29 | 11,7 | 13 928 558 | 1 392 856 |
| 18 | 30 | 11,7 | 13 928 558 | 1 392 856 |
| 19 | 37 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 20 | 38 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 21 | 39 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 22 | 40 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 23 | 41 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 24 | 42 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 25 | 43 | 9,6 | 11 428 560 | 1 142 856 |
| 26 | 44 | 9,6 | 11 438 560 | 1 143 856 |
| 27 | 45 | 10,6 | 12 619 035 | 1 261 904 |
| 28 | 46 | 10,2 | 12 142 845 | 1 214 285 |

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Аукцион состоится 26 ноября 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 23 ноября 2007 года до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: 227 48 36, 227 40 22 —**
УП «Минский городской центр недвижимости»

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

16 ЛІСТАПАДА 2007 г. ПЯТНІЦА № 47 (15498)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# ЗА ДВУМА АТЭСТАТАМІ

**пагоняцца 15 вучняў Бялыніцкай сярэдняй школы № 2, якія пачалі дыстанцыйнае навучанне ў элітнай маскоўскай школе. Яны ўпэўненыя, што гэта, у адрозненне ад вядомай прымаўкі, вельмі дапаможа ім у далейшым жыцці.**



Упершыню ў Магілёўскай вобласці дзецям даюць шанц атрымаць два атэстаты аб сярэдняй адукацыі: адзін — беларускага ўзору, а другі — расійскага. Гэта стала вынікам супрацоўніцтва рэгіёна з Усходняй адміністрацыйнай акругай Масквы.

Гэта гісторыя пачалася некалькі гадоў таму, калі Масква і Магілёў абменьваліся дэлегацыямі, у складзе якіх былі і работнікі сферы адукацыі. Уладзіміру Котаву, дырэктару школы № 2, што ў раённым цэнтры Бялынічы, прапанавалі супрацоўнічаць з маскоўскай школай.

Школа № 792 мае вядомасць у расійскай сталіцы як эксперыментальная пляцоўка Акадэміі педагагічных і сацыяльных навук Расіі. Ужо шмат гадоў гэта школа асацыяваная пры ЮНЕСКА, і таму робіць націск на вывучэнне агульначалавечых дысцыплін — культуры, духоўных каштоўнасцяў, традыцый, рэлігіі, замежных моў.

Масквічы прапанавалі бялыніцкай школе арганізаваць дыстанцыйнае навучанне дзяцей. Цяпер гэта праграма пачала ажыццяўляцца.

— Мы атрымалі поштай расійскія падручнікі і цяпер праз Інтэрнэт — першыя заданні, — расказаў Уладзімір Котаў. — Мы дамовіліся з маскоўскімі партнёрамі, што заданні будуць прыходзіць два-тры разы на месяц, каб настаўнікі маглі выстаўляць вучням адзнакі на працягу навучальнага года. Праўда, пакуль не ведаем, паводле якой шкалы будуць з намі працаваць масквічы: 10-бальнай беларускай альбо сваёй 5-бальнай.

Выконваць заданні прадстаіць вучням ад 6-га і да 10-га класа. Адбіралі іх, канешне, з улікам узроўню ведаў — іх адзнакі не ніжэйшыя за 7 балаў. Не забыліся запытацца ў бацькоў: раз на год вучні з Бялынічаў павінны адправіцца на тыдзень у Маскву, дзе іх забяспечаць жыллём і ежай, але за праезд давядзецца плаціць самастойна. І, нарэшце, самае галоўнае — жаданне вучыцца.

— Гэта для мяне зусім не забава, а сур'ёзная справа, — цвёрда сказала вучаніца 10 «Б» класа Маша Атрошкіна. — Канешне, вучоба ў яшчэ адной школе запатрабуе часу, але я свядома іду на гэта. Час для вучобы я заўсёды знайду, бо трэба ўжо думаць пра паступленне ў ВНУ. Што ж, меней буду глядзець тэлевізар, але гэта таго каштуе.

Маша плануе звязаць сваё жыццё з медыцынай, а яе аднакласніца Насця Селівестрава — з матэматыкай і інфарматыкай. Насця стала першай у Бялыніцкім раёне па алімпіядзе па інфарматыцы. Дзяўчынкі лічаць камп'ютарнае навучанне вельмі цікавай справай і гатовыя прымаць маскоўскія заданні на хатніх компах.

— Мне гэта цікава, — гаворыць Насця. — Расія — усё ж такі іншая краіна, і мне хочацца даведацца, як і чаму там вучаць. Думаю, што справлюся з расійскай праграмай. Я пагледзела падручнікі, але нічога надта цяжкага там не знайшла. Будзем працаваць.

Уладзімір Котаў і яго калегі з расійскімі падручнікамі таксама пазнаёміліся. Яны гавораць, што адрозненне ад беларускай праграмы ёсць: часам і аб'ём большы, і матэрыял больш складаны.

— Трэба паспрабаваць, — лічыць дырэктар. — І няхай там планка будзе вышэй, гэта падгоніць імкненні бялыніцкіх дзяцей. Як у спорце больш карысна сустрэцца з моцным сапернікам і атрымаць вопыт, так і ў вучобе. Я ў маскоўскай школе наведаў адкрытыя ўрокі і мяркую, што нашы вучні адолеюць расійскія заданні. Толькі каб у іх было жаданне.

У вучаніц 8 «В» класа аж вочы гараць ад імкнення хутчэй прыступіць да маскоўскіх заданняў і пераканаць усіх аднакласнікаў, што іх недарэмна выбралі для ўдзелу ў праграме дыстанцыйнага навучання.

— Нас толькі чацвёра з усяго класа, і астатнія, мне падаецца, крыху зайздросцяць, але яшчэ больш ганарацца намі, — расказвае Таня Пятрушэня.

— Расійскія падручнікі нас не спалохалі, — падхоплівае Света Абломава. — З алгебрай, мяркую, справімся, а вось з літаратурай будзе складаней: там у праграме ёсць творы расійскіх і замежных пісьменнікаў, якія мы не вывучаем і не ведаем.

— Нагрузка, канешне, падвоіцца, але трэба так арганізаваць жыццё, каб і вольны час заставаўся, — зусім па-даросламу правільна тлумачыць Каця Харытонава. — Затое мы ў Маскву паедзем для таго, каб пазнаёміцца з настаўнікамі і павучыцца на месцы, а гэта ж столькі знаёмстваў з новымі цікавымі людзьмі! Ды і веды нам у жыцці спатрэбяцца.

— Я хачу стаць перакладчыцай, а ў маскоўскай праграме ёсць англійская мова, — паведаміла Марына Цохціева. — Мне будзе лягчэй. Таму што закончыць дзве школы — гэта ўдвая больш шанцаў паступіць у прэстыжны інстытут.

Маскоўскі атэстат аб сярэдняй адукацыі сапраўды дае дадатковыя магчымасці абітурыентам. Дарэчы, усе выпускнікі школы № 792 становяцца студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў — цалкам 100 працэнтаў. Гэтая школа заключыла дамовы з дзесяццю вядомымі маскоўскімі ВНУ, і беларускім выпускнікам школы таксама абяцаюць пры паступленні калі не ільготы, то хоць бы падтрымку. Усё ж такі гэта першы падобны эксперымент: супрацоўніцтва расійскай сталічнай сярэднеадукацыйнай установы і беларускай школы, якая месціцца ў раённым цэнтры. Прычым гэта супрацоўніцтва не на ўзроўні прыемных сустрэч, экскурсій і абмену вопытам, а ў самой справе навучання дзяцей.

— Мы ўсе спадзяёмся, што нешта атрымаецца, — падбадзёрвае сваіх вучняў Уладзімір Котаў. — І нехта з бялыніцкіх дзяцей скарыстае свой шанц і паступіць у маскоўскую ВНУ. Такога ў нашай школе яшчэ не было. Безумоўна, можа, і не ўва ўсіх атрымаецца і нехта адступіць. Але ў любым выпадку паспрабаваць трэба. І настаўнікам, і дзецям гэта цікава.

**Ілона ІВАНОВА.**
*Бялыніцкі раён.*

## ТАЛЕНТАМ І ПРАЦАВІТАСЦІ — ПАДТРЫМКА

**Віноўнікамі ўрачыстасці на юбілейнай, дзесятай цырымоніі ўручэння стыпендый імя Аляксандра Дубко Гродзенскага аблвыканкама былі дваццаць школьнікаў, дзевяць студэнтаў трох універсітэтаў, а таксама дзесяць навучэнцаў каледжаў і вучылішчаў. Гэта пераможцы і прызёры абласных і рэспубліканскіх алімпіяд, конкурсаў, спартакіяд і фестываляў. Памер стыпендыі, якая выплачваецца аднаразова, склаў каля 400 тыс. рублёў.**

З моманту заснавання стыпендыі абласнога выканаўчага камітэта за высокія дасягненні ў вучобе, творчасці і спорце (з 2001 года яна носіць імя Аляксандра Дубко) лаўрэатамі сталі 170 школьнікаў і 63 студэнты, а сёлета ўпершыню ўзнагародзілі навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Раўняцца ёсць на каго. Да прыкладу, адзін з першых стыпендыятаў Аляксандр Паплаўскі сёння выкладае фізіку і астраномію ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка і выбраны членам Каралеўскага Брытанскага астранамічнага таварыства.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## «Fest-ART.by»: давайце знаёміцца...

**Учора на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі адбылося ўрачыстае адкрыццё Рэспубліканскага фестывалю творчасці замежных студэнтаў «Fest-ART.by».**

На сёння ў беларускіх вышэйшых навучальных установах навучаецца каля 7 тысяч іншаземцаў з 72 краін СНД, Балтыі і далёкага замежжа. Святочныя мерапрыемствы з удзелам беларускіх і замежных студэнтаў сталі добрай традыцыяй і праводзяцца ўжо ў рамках Міжнароднага дня студэнта.

Фестываль творчасці замежных студэнтаў расцягнецца на цэлы месяц (у рамках якога будзе прадстаўлена шырокая геаграфія і стракатая палітра творчай дзейнасці беларускіх і замежных студэнтаў), а падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне самых актыўных удзельнікаў адбудзецца 14 снежня ў Беларускім таварыстве сяброўства і культурных сувязяў з замежнымі краінамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Здароўе, мода, стыль

**Беларускія дызайнеры змаглі паспрачацца за званне лепшага ў стварэнні мадэляў вопраткі з лёну.**

Пра карысць адзення з лёну вядома даўно, але першае, што ўяўляецца — простая кашуля. На фестывалі «Лён-2007», што прайшоў у рамках Беларускага тыдня моды, нават самыя закаранелыя скептыкі паглядзелі на лён з іншага боку. Буйства колераў, лёгкія тэкстуры, смелыя позіркі на класічныя рэчы — усё гэта панавала ў калекцыях адзежы з лену беларускіх дызайнераў. Кожны мог знайсці мадэль на свой густ ад класікі да экстрэмальнага мадэрна, аднак усе калекцыі аб'ядноўвалі цудоўны дызайн і модныя напрамкі. Намаганнямі беларускіх дызайнераў беларуская льняная вопратка добра прадаецца за мяжой. Ім паспяхова ўдаецца ўлівацца ў сусветны модны трэнд. Застаецца толькі спадзявацца, што вясной і мы паспеем набыць льняную абноўку ад беларускага куцюр'е.

**Фота Вольгі ЛАСКІ.**







Вучымся і працуем

## ТЭОРЫЯ БЕЗ ПРАКТЫКІ, ШТО СУП БЕЗ СОЛІ

**Ты студэнт як мінімум трэцяга курса Белдзяржуніверсітэта? Працаваць над курсавымі работамі табе ў радасць? Без навукі не ўяўляеш свайго жыцця? Стыпендыі на месяц не хапае, а бацькам палёгку хочацца зрабіць? Тады не губляй дарэмна час — паспрабуй уладкавацца лабарантам у сваёй ВНУ.**

Зараз у БДУ працуе 99 студэнтаў: 57 з іх займаецца навукай, астатнія 42 з'яўляюцца лабарантамі-сакратарамі на кафедрах, лабарантамі ва ўніверсітэцкім спартыўным комплексе, садоўнікамі, дворнікамі...

— Усякая праца ў павазе, — перакананы старшыня ўпраўлення кадраў Белдзяржуніверсітэта Алег Клімковіч. — Ды і капейка лішняй не бывае. Тым больш студэнту. Мы заўсёды рады маладым людзям, якія добра вучацца і мараць папоўніць прафесарскі састаў свайго ўніверсітэта (многія, выбраўшы пасаду лабаранта, пасля заканчэння 5-га курса, як правіла, застаюцца працаваць у сваёй альма-матэр).

— Працуюць у нас студэнты лабарантамі на кафедрах, пачынаючы з трэцяга курса, — расказвае намеснік старшыні кіравання кадраў па навуковых падраздзяленнях Ларыса Багданава. — Бо на працягу першых двух гадоў навучання ідзе акліматызацыя студэнта, ён мае час для выбару тэмы, якая яго цікавіць. Але некаторыя выкладчыкі не згодны з такім падыходам: яны лічаць, што ў многіх студэнтаў цяга да навукі знікае да трэцяга курса.

**— Уявім, што я студэнтка-трэцякурсніца і хачу стаць лабарантам. Ларыса Міхайлаўна, што мне трэба зрабіць для рэалізацыі свайго жадання?**

— Калі студэнт захацеў уладкавацца на працу, яму патрэбна ўзяць даведку з дэканата, якая сведчыць аб поспехах у вучобе, знайсці куратара (ім можа быць выкладчык, старэйшы выкладчык, дацэнт, прафесар, навуковы супрацоўнік), прайсці тэхніку бяспекі. Дарэчы, не абавязкова працаваць на сваім факультэце. Калі ёсць жаданне, а галоўнае вольнае месца, то накіроўваем студэнтаў на іншы факультэт.

Паводле слоў Ларысы Багданавай, згодна з дзеючым працоўным кодэксам з кожным студэнтам-лабарантам заключаецца працоўны дагавор. Акрамя гэтага, новы работнік ставіцца на персаніфікаваны ўлік і яму выдаецца страхавое пасведчанне. Гэта вельмі зручна: такім чынам студэнт можа мець працоўную кніжку. Па заканадаўству студэнты дзённай формы навучання могуць працаваць выключна на паўстаўкі, гэта чатыры гадзіны ў дзень. Пачатак рабочага дня залежыць ад змены, у якую вучыцца студэнт.

**— А пасада інжынера даступная для студэнта?**

— Да інжынера ж, у адрозненне ад лабаранта, іншыя патрабаванні: сярэдняя ці вышэйшая адукацыя, якой у студэнта часцей за ўсё няма. Але з любой сітуацыі ёсць выйсце. Студэнт пятага курса можа на перыяд вытворчай практыкі ўладкавацца на працу інжынерам на поўную стаўку і атрымліваць за гэта грошы.

**— І які заробак маюць такія студэнты?**

— Паўстаўкі лабаранта і інжынера на сённяшні дзень складаюць — 90 272 беларускія рублі плюс дзесяць працэнтаў за стаж работы ў галіне адукацыі (ад 0 да 5 гадоў). Калі студэнт добра працуе, яму могуць устанавіць надбаўку.

Акрамя пастаяннай занятасці (дагавор падпісваецца на вучэбны год (летам выкладчыкі ідуць у водпуск), а пасля працягваецца), маецца яшчэ адна форма — часовыя навуковыя калектывы. У гэтым выпадку афармляецца не працоўны, а грамадзянска-прававы дагавор (кароткачасовы для вырашэння канкрэтных задач).

У цэнтры інфармацыйных тэхналогій зараз працуе лабарантам аспірант Віктар Кочын, — паведаміла мне Ларыса Міхайлаўна.

Не раздумваючы, накіравалася ў галоўны корпус універсітэта, дзе і пазнаёмілася з Віктарам.

— Лабарантам стаў на 4 курсе. Да гэтага таксама не сядзеў склаўшы рукі. Пасля 2 курса летам ездзіў працаваць у ЗША, пасля 3 курса — працаваў у вылічальным цэнтры, — расказвае Віктар. — Я заўсёды добра вучыўся, таму пытання наконт аспірантуры не ўзнікала. Лічу, што кожны павінен рабіць тое, што ў яго лепш атрымліваецца. Мне пашанцавала з навуковым кіраўніком. Менавіта Юрый Іосіфавіч Варатніцкі параіў мне ўладкавацца ў цэнтр інфармацыйных тэхналогій. У студэнцкія гады я працаваў тут над сваімі курсавымі і дыпломнай работай. Зараз жа працую над кандыдацкай, тэма якой звязана з сеткамі перадачы дадзеных.

Віктар пераканаўся, што тэорыя без практыкі, як суп без солі — есці можна, але нечага не хапае. Таму тым студэнтам, якія цікавяцца навукай, зыходзячы з уласнага вопыту, хлопец раіць практыкавацца лабарантамі на кафедрах факультэта.

**Надзея ДРЫЛА.**

Акцыя

## «Суд над тытунём»

**Пад такой назвай прайшло цэнтральнае мерапрыемства, праводзімае ў межах кампаніі «Не курэнню!» Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі і Рэспубліканскім цэнтрам гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.**

15 лістапада, у Міжнародны дзень адмаўлення ад курэння ля Беларускага Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта ў Мінску адбыўся суд над тытунём. Падчас акцыі кожны жадаючы мог абмяняць цыгарэту на цукерку, забіць цвік у муляж цыгарэты, атрымаць інфармацыйныя буклеты і лістоўкі аб праблемах курэння з парадамі, як пазбавіцца ад шкоднай звычкі. Завяршылася мерапрыемства масавым знішчэннем цыгарэт, якія прапусцілі праз мясарубкі.

У межах кампаніі «Не курэнню!» тэматычныя маладзёжныя акцыі прайшлі па ўсёй краіне. Тэрытарыяльныя структуры БРСМ на базе сваіх пярвічак арганізавалі лекцыі, семінары, дыспуты, выпуск маладзёжных радыёперадач, конкурсы малюнкаў, фотаработ, сачыненняў на тэму барацьбы з курэннем.

**Іна АРЭХАВА.**

Зборная Беларусі

## РЫБАК, які «вудзіць» медалі



*Наша анкета.* **ЮРЫЙ РЫБАК.**
*Мянушка.* ***Чалавек з такім прозвішчам, як Рыбак, у ёй патрэбы не мае. Цікава, што на рыбалку спартсмен ездзіў вельмі даўно, а звычайна «вудзіць» не рыбу, а медалі.***
*Захапленні.* ***Разгадванне крыжаванак і чытанне гістарычнай літаратуры. З аўтараў аддае перавагу Валянціну Пікулю.***
*Адпачынак.* ***На пытанне, якому б віду адпачынку ён перш за ўсё аддаў бы перавагу, адказаў: «Адпачыць, выспацца».***
*Мара.* ***Быць больш побач з сям'ёй і вызначыцца на Алімпіядзе.***

У які ўжо раз даводзіцца шкадаваць, што самба не алімпійскі від спорту. Беларус Юрый Рыбак ужо тройчы станавіўся мацнейшым у свеце ў гэтым відзе адзінаборстваў. На спаборніцтвах жа па дзюдо лепшае дасягненне прапаршчыка спартыўнай каманды ўнутраных войскаў МУС — другое месца на планетарным форуме-2007. Нехта не зразумее: навошта ўдзельніку Алімпіяды ў Афінах разрывацца на два франты, калі лепш сканцэнтравацца на алімпійскім відзе спорту — дзюдо. На гэты пункт гледжання ў Юры свае аргументы.

— У перадалімпійскі год я, зразумела, больш увагі ўдзяляю дзюдо, а так мне зусім не цяжка выступаць і ў кімано, і ў самбісцкай куртцы. Праблема толькі ў тым, што мне патрэбны час, каб пераключыцца з самба на дзюдо і наадварот. У нашай камандзе не я адзін і самбіст, і дзюдаіст. Для мяне ўсе мае медалі і па самба, і па дзюдо аднолькава дарагія, хоць самба не алімпійскі від спорту.

Такая адданасць самба прыносіць сваю карысць: на сёлетнім чэмпіянаце свету жыхар Дзяржынска заваяваў сваё чарговае «золата» і ў складзе беларусаў заняў першае агульнакаманднае месца. «Турнір сабраў рэкордную колькасць самбістаў, але я на сабе не адчуў ніякіх змен. Гэта ж не першыя мае спаборніцтвы», — дзеліцца ўражаннямі пераможца.

У гісторыі беларускага дзюдо ўжо ёсць алімпійскі чэмпіён — Ігар Макараў, а мець яшчэ аднаго, вядома ж, не пашкодзіць. Аднак, каб не сурочыць, загадваць нічога не стану. Юрый расказаў, што ўжо бываў у Кітаі, дзе пройдзе Алімпіяда, краіна яму не надта спадабалася, але спаборнічаць там можна будзе. У сваёй цяжкай вагавой катэгорыі (больш як 100 кілаграмаў) ён адчувае сябе ўтульна. Аднак часам даводзіцца сябе абмяжоўваць у ежы: «Я не магу абысціся без булачак, — прызнаецца Юрый. — Я наогул аматар салодкага». На пытанне, што ж ён можа прыгатаваць сам, адразу выпальвае — «Чай!». Гатаваць у яго сям'і ёсць каму. З задавальненнем спартсмен прыязджае ў вёску да сваёй бабулі — на бліны з малаком і іншую смакату.

Магчыма, таму што яму даводзіцца бываць у раз'ездах па розных краінах на ўсялякіх спаборніцтвах і па самба, і па дзюдо, Юрый Рыбак вельмі цэніць дом: «Па натуры я не тусоўшчык, а дамасед, ды і няма чаго блытацца, калі я ўжо сямейны чалавек. Лепш з сям'ёй правесці вольны час, пахадзіць разам па магазінах». У спартсмена дзве дачкі і аддаваць дзяўчынак у дзюдо ці самба бацька не збіраецца, бо лічыць гэта не жаночым заняткам.

— Мая старэйшая дачка займаецца ў музычнай школе, вучыцца іграць на гітары, — з гонарам кажа Юрый, — а малодшая любіць глядзець як бацька трэніруецца. Яна мая галоўная балельшчыца. Дарэчы, днямі мы пісалі з дачкой ліст Дзеду Марозу, каб ён прынёс падарункі на Новы год (*усміхаецца*). Я сам з задавальненнем прывожу дзецям падарункі, звычайна лялькі і салодкае, з краін, дзе праходзяць спаборніцтвы.

Калі ж размова заходзіць аб жонцы, Юрый характарызуе яе як свой надзейны тыл: «Яна і гатуе, і ўтульнасць дома стварае, і хатнія праблемы вырашае, і на школьныя сходы ходзіць». Рыбак не загадвае, ці звяжа сваё жыццё з сілавымі структурамі, калі «завяжа» са спортам. Зараз у яго іншая мара — паехаць на летнія Алімпійскія гульні ў Кітай і выступіць там на высокім узроўні. Ёсць і сямейныя планы, але аб іх ён не стаў расказваць, бо гэта вельмі асабістае.

**Ірына ПРЫМАК.**
**Фота Вольгі ЛАСКІ.**

## ПРАГА ЯЗДЫ

**Фактычна з пачатку года матацыклы і ўсё, што з імі звязана, знаходзіцца ў поле зроку супрацоўнікаў ДАІ і ўчастковых інспектараў міліцыі Гродзеншчыны. У сельскай мясцовасці праводзіліся падворныя абходы. Такім шляхам выяўляліся безгаспадарныя, незарэгістраваныя, а таксама матацыклы, якія працяглы час не эксплуатуюцца, і іх уладальнікі, якія не мелі права кіравання. Ахвотнікі выкарысталі магчымасць атрымання права кіравання шляхам здачы экзаменаў у ДАІ экстэрнам. У Гродне і райцэнтрах сярод матацыклістаў арганізоўваліся конкурсы вадзіцельскага майстэрства, пераможцы якіх таксама атрымалі адпаведныя пасведчанні.**

Колькасць здарэнняў, якія за дзевяць месяцаў па вобласці здзейснілі матацыклісты, у параўнанні з мінулым годам зменшылася амаль на трэць (на 31,1 працэнта). А ў Гродзенскім раёне першая і адзіная за гэты перыяд падобная аварыя здарылася 20 красавіка. У той дзень у вёсцы Новая Гожа падлетак, які не меў праву, кіраваў «Дняпром» і наехаў на земляны насып. Пацярпеў яго юны аднавясковец. 31 кастрычніка юнак, які не меў праваў, па дарозе Гродна—Гожа—мяжа Літоўскай Рэспублікі ездзіў без шлема на матацыкле «Мінск». Ля вёскі Крынічнае стаў разварочвацца. Не пераканаўшыся ў бяспецы гэтага манеўра, ён сутыкнуўся з аўтапоездам «Вольва». Пацярпелы памёр на месцы здарэння.

Каментуючы гэты факт, намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ УУС аблвыканкама Анатоль Клімаў паведаміў, што загінулы тройчы затрымліваўся за рулём нецвярозым (у 2004, 2006 і 2007 гадах). Раней ён жа здзейсніў ДТЗ. Апошні раз сёлета ў жніўні гэты малады чалавек, які кіраваў сваім матацыклам у нецвярозым стане, быў затрыманы шляхам праследавання. Патрабаванні супрацоўнікаў ДАІ аб спыненні руху ён праігнараваў і, даімчаўшыся да сваёй хаты, уехаў у хлеў, які быў адчынены. Высветліць, каму матацыкл належыць, перашкодзіла маці. Месяц таму з гора-вадзіцелем меў размову замацаваны за тэрыторыяй Гожскага сельсавета інспектар ДПС ДАІ. Юнак запэўніў, што матацыкл не эксплуатуе, аднак прад'явіць яго для агляду ўсё роўна адмовіўся.

**Алег ДУК, старшы інспектар ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Шукаем будучых профі

## ЖУРНАЛІСЦКІЯ КАДРЫ ДЛЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ

**Кадравыя праблемы ў мясцовых СМІ па-ранейшаму застаюцца не да канца вырашанымі — толькі палова штатных супрацоўнікаў рэдакцый мае спецыяльную журналісцкую адукацыю. Гэтае пытанне было асноўным на семінары, які адбыўся ў Віцебску. Сустрэча выкладчыкаў факультэта журналістыкі БДУ, прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі, кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама, рэдактараў рэгіянальных, гарадскіх і раённых газет дазволіла скаардынаваць працу педагогаў і практыкаў па пошуку журналісцкіх талентаў у глыбінцы.**

Сімвалічна, што гэтае мерапрыемства адбылося неўзабаве пасля выдатнай юбілейнай даты — 75-годдзя прафесійнай журналісцкай адукацыі ў Беларусі. Створаны ў 1932 годзе Камуністычны інстытут журналістыкі (КІЖ) да вайны рыхтаваў кіруючых работнікаў для газет, часопісаў, радыё, выдавецтваў. Сёння Вучоны Савет БДУ ўжо зацвердзіў рашэнне аб рэарганізацыі ў 2008 годзе факультэта журналістыкі ў Інстытут журналістыкі.

Дэкан факультэта журналістыкі БДУ, дацэнт Сяргей Дубовік адзначыў, што павялічыўся конкурс, на ўсіх аддзяленнях вучацца былыя выхаванцы школ і клубаў юных журналістаў, створаных пры рэдакцыях многіх мясцовых газет. Разам з тым мэтанакіраваная праца па забеспячэнні «раёнак» кадрамі толькі пачынаецца. Нявырашанай пакуль што праблемай застаецца замацаванне маладых спецыялістаў у райцэнтрах. Сёння на бюджэтнае аддзяленне факультэта журналістыкі набіраем 105 чалавек, яшчэ 40 — на завочнае. Гэта няшмат, калі ўлічваць, што колькасць толькі друкаваных СМІ ў рэспубліцы дасягае амаль 1300. Зразумела, што большасць нашых выпускнікоў знаходзяць сабе працу ў беларускай сталіцы, у глыбінку размяркоўваюцца літаральна адзінкі. Але і тыя маладыя спецыялісты, якія ўліліся ў штаты раённых газет, маюць праблемы з жыллём, атрымліваюць невысокія зарплаты.

Інстытут журналістыкі, які будзе створаны мае мэтай вырашыць вострыя кадравыя праблемы ў рэгіёнах. З 1 верасня 2008 года адкрываецца новая спецыяльнасць — WEB-журналістыка. Факультэт перападрыхтоўкі кадраў будзе рыхтаваць спецыялістаў з журналісцкім дыпломам на базе вышэйшай адукацыі. Адным з істотных рэзерваў можа стаць набор на трэці ці чацвёрты курс студэнтаў з іншых факультэтаў, якія праявілі літаратурныя здольнасці. Не трэба скідваць з рахунку і такую форму, як мэтавы набор на стацыянар па заяўках мясцовых СМІ, магчымасць набыць журналісцкую адукацыю на завочнай форме навучання.

Літаральна ў лютым 2008 года будзе адкрыты аўдыторны корпус па вуліцы Кальварыйскай, дзе студэнтаў і журналістаў-практыкаў чакаюць добра абсталяваныя аўдыторыі, вучэбныя лабараторыі з сучаснай аўдыё- і відэатэхнікай. У праекце новага будынка прадугледжана нават месца для работы асобнага тэлеканала ў складзе БДУ, які будзе мець адукацыйны напрамак.

Праблему ўдасканалення газетна-часопісных кадраў, сацыяльнай сталасці будучых журналістаў закранулі ў сваіх выступленнях саветнік міністра адукацыі, прафесар В. Іўчанкаў, начальнік Упраўлення ідэалагічнай работы Віцебскага аблвыканкама М. Кузьміч, галоўны спецыяліст упраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі А. Шычко, намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Р. Сакалоўскі, загадчык кафедры перыядычнага друку факультэта журналістыкі БДУ, дацэнт А. Своpаб. Аб супрацоўніцтве рэдакцый газет з творчымі клубамі юных журналістаў расказалі галоўны рэдактар «Полацкага весніка» В. Часнавіцкая, галоўны рэдактар «Новой газеты» (г. Наваполацк) П. Бурдыка, галоўны рэдактар газеты «Лепельскі край» У. Шаўчэнка.

Намеснік дэкана па рабоце з абітурыентамі, дацэнт Н. Зубчонак, загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання, дацэнт В. Булацкі, намеснік дэкана па творчых сувязях са СМІ, дацэнт А. Градзюшка сустрэліся ў памяшканні школы № 45 з будучымі абітурыентамі. На Дзень адчыненых дзвярэй сюды прыйшлі больш як 150 школьнікаў старэйшых класаў горада Віцебска.

**Пётр ДАРАШЧОНАК, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры БДУ, дацэнт.**

